Тыднёвік Магілёўскі

№ 31 (31)
19.12.97.

ДЛЯ ТМ ПА ЭЛЕКТРОННАЙ ПОШЦЕ

ЗЯНОН ПАЗЬНЯК правёў у Кангрэсе ЗША прэсавую канферэнцыю, асноўную частку якой прысвяціў пытанням змагання людзей добрай волі за вызваленне юных беларускіх палітвязьняў Вадзіма Лабковіча і Алеся Шыдлоўскага.

СОЙМ БНФ у мінулую суботу абвясціў аб пачатку кампаніі па збору подпісаў за адстаўку Лукашэнкі з прэзыдэнцкай пасады.

ЛАРЫСА ЛАПШЫНА, кіроўца тралейбуса ў Бабруйску, змушаная пад ціскам адміністрацыі звольніцца з працы і не дамогшаяся справядлівасці праз галадоўку, спрабуе адстаяць свае правы праз суд, які раз за разам пераносіцца.

ВАСІЛЬ ЛЯОНАЎ, месяц назад арыштаваны ў сваім міністэрскім кабінэце перад камерамі БТ, паводзіць сябе за кратамі КДБ вытрымана і сканцэнтравана, не дазваляючы сабе паслабнуць маральна і фізычна: ранішняя зарадка і шматкіламетровы шпацыр па камеры —ягоная штодзённая норма.

БЕЛАРУСКУЮ ХАРТЫЮ — 97 да гэтага дня падпісалі больш за 300 тысячаў дэмакратычна настроеных людзей, а таксама дзесяткі партый, грамадскіх арганізацый, творчых суполак, сярод якіх няма подпісу ПКБ, бо камуністаў засмучае ў гэтым дакумэнце словазлучэнне "чырвоная дыктатура".

ДЗІЎНАЯ СПРЭЧКА за авалоданне магілёўскім Палацам Каніскага разгарэлася гэтымі днямі паміж гарадскім музеем і кіраўніцтвам праваслаўнай парафіі, у якой адзін бок настойліва і дакумэнтальна даводзячы факт "дзяржаўнай" прыналежнасці будынка рызыкуе наклікаць з Расеі нечаканых нашчадкаў, а другі — проста хлусіць, як гэта і прынята ў краіне "праваслаўнага атэізму".

У ЧАРГОВЫ РАЗ ад ветэранаў Другой сусветнай вайны на прасторах былой савецкай імпэрыі "цэнтральная" улада адкупілася новымі памятнымі медалямі — у гонар 50-годдзя Перамогі, уручэнне якіх пачалося і ў Беларусі ў той час, як былыя салдаты даўно забыліся нават на ранейшыя сціплыя ільготы, не гаворачы пра жыллёвыя, цэнавыя і тэлефонныя.

Праваабарончы пікет у Магілёве

10 снежня, у міжнародны Дзень правоў чалавека, у Магілёве адбыўся пікет. Яго арганізатарам выступіла мясцовая філія Беларускага Хельсінскага Камітэту. Актыўны ўдзел у акцыі, як заўсёды, прынялі сябры Свабоднага прафсаюзу і Беларускага Народнага Фронту.

З пяці плакатаў, якія былі разгорнутыя з палове пятай увечары каля гатэлю "Днепр", да канца пікету ўдзельнікі захавалі толькі чатыры. Вось іх змест: *Свабоду — "Свабодзе"!, Свабоду — Дзецям!, Свабоду — Палітвязням!, Вадзім Лабковіч і Алесь Шыдлоўскі —сядзяць за кратамі толькі за тое, што любяць Беларусь.* Канфіскаваны міліцыянтамі на самым пачатку пікету плакат быў наступнага зместу: *"Камунізм, сталінізм, лукашызм — досыць!".*

Падчас акцыі яе ўдзельнікі распаўсюджвалі газэту "Рабочий" і наш ТЫДНЁВІК, куды быў укладзены тэкст Агульнай Дэклярацыі правоў чалавека. Трэба заўважыць, што як і папярэднія восеньскія пікеты, гэты прыцягнуў да сябе ўвагу грамадзкасці. Было шмат гутарак з людзьмі, якія ставіліся да арганізатараў і іхніх мэтаў вельмі добра і спачувальна. Многія з іх, на жаль, проста не ведалі аб тым, што 15-ці і 16-ці гадовыя хлопцы —В.Лабковіч і А.Шыдлоўскі ўжо некалькі месяцаў сядзяць за кратамі за **насценныя надпісы на беларускай мове.** А калі людзі аб гэтым даведваліся, то рэакцыя амаль ва ўсіх была аднолькавая: шок.

Былі замовы на газэту "Свабода", выхад якой спыніў існуючы палітычны рэжым. Але ж і "Тыднёвік", і "Рабочий" разыходзіліся добра, нават адзін з міліцыянтаў, што прысутнічаў на акцыі, зацікавіўся "апазыцыйнай прэсай" і таксама атрымаў сваю "порцыю". Дарэчы, атрымаў з рук Валадзея Цурпанава, які толькі што выйшаў з бальніцы, але адпачываць ад "палітыкі" не стаў, наадварот — адразу ж прыняў удзел у праваабарончай акцыі.

Напрыканцы пікету я злавіў сябе на такой думцы: калі б падобныя акцыі праходзілі па ўсёй Беларусі, і як мага часцей, людзей недасведчаных у справах абароны сваіх уласных правоў, якія павінны быць гарантаванымі ўладамі краіны, у хуткім часе ў нас проста б не засталося.

В.С.

Заўвага пікетоўшчыка

Апошнім часам вельмі часта ў афіцыйных сродках масавай інфармацыі можна пачуць пра тое, што "Дэклярацыя правоў чалавека" выконваецца ў нас поўнасцю. Некаторыя вышэйшыя кіраўнікі краіны кажуць, што правоў у грамадзянаў Беларусі больш, чымсьці нават у Заходняй Эўропе. Але іншыя словы даводзіцца ставіць пад сумнеў, і вось чаму.

10 снежня я ўдзельнічаў у пікеце ў абарону правоў чалавека, каб выказаць сваё стаўленне да таго, як у нас выконваецца Агульная Дэклярацыя (якую, дарэчы, Беларусь таксама падпісала). Праблемы ў пікетоўшчыкаў пачаліся адразу. Спачатку да нас падыйшлі міліцыянты й пачалі правяраць дакументы ў прадстаўніка БХК сп. В.Сеўкі. Потым яны пачалі чапляцца да плякатаў "Свабоду палітвязням" ды "Камунізм, сталінізм, лукашызм —досыць!". Нарэшце, апошні плякат афіцэр міліцыі ўсё ж адабраў. Але гэта яшчэ не ўсё. Міліцыянты спрабавалі давесці, што раздаваць тэкст Дэклярацыі правоў чалавека забаронена, бо на ёй не пазначаны ...выхадныя дадзеныя!

Такім чынам, шаноўнае спадарства, мяркуйце самі, як кіраўніцтва нашай краіны выконвае правы чалавека. Калі вы запытаецеся ў самых сябе: ці магу я сёння свабодна выказаць свае думкі? — можа быць, вы знойдзеце адказ на пытанне: а дзе ж тыя правы чалавека, якіх у нас "больш, чымсьці ў Эўропе"?

СЯРЖУК ГІРКІН.

Дай табе Бог, Беларусь!



Каляднае віншаванне пробашча касцёла св.Станіслава на 3-й старонцы ТМ.

...Здабытак цывілізацыі, а не слуга палітыкі

Днямі ў Менску прайшла чацвёртая за сёлетні год канферэнцыя, арганізаваная Беларускай асацыяцыяй журналістаў, Саветам Эўропы і Міжнародным камітэтам "Артыкул 19". Прадстаўнікі замежных арганізацый Марыё Айтхамэр, Тобі Мэндэл і Весна Алабурыч спазніліся да нас на дзень з-за ўмоваў менскага надвор'я і лёнданскага аэрапартовага пажару. Затое другі дзень работы канферэнцыі, калі ўсім замежнікам давялося выступаць "залпам", надаў актуальнай гаворцы максімальную саліднасць і глыбіню. Стала відавочным, што прававыя аспекты свабоды слова — а такой была тэма канферэнцыі — зьяўляюцца і застаюцца клопатам цывілізацыі, а не інструмэнтам злабадзённай палітыкі. Адсюль такая міжнародная ўвага і занепакоенасць да падзеяў у Беларусі: тое, што тут адбываецца апошнім часам, зьяўляецца відавочнай пагрозай гуманітарным здабыткам чалавецтва. Закрыццё "Свабоды", Радыё 101.2, пераслед Паўла Шарамета, Дзмітрыя Завадскага, Валерыя Шчукіна, Ірыны Халіп, складанасці з акрэдытацыяй замежных карэспандэнтаў, закрытасць улады, пераўтварэнне дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі ў "рупары" афіцыйнай палітыкі, а цяпер яшчэ і ў "інстанцыі кантролю" — усё гэта нясе пагрозу інфармаванасці, асвеце і маралі грамадства цэлай краіны. Краіны, якая між тым падпісала асноўныя міжнародныя пагадненні ў галіне правоў і свабодаў чалавека. Правы на вольныя думку і слова прызнаюцца сярод іх найпершымі.

Сярод удзельнікаў канферэнцыі была распаўсюджана ЗАЯВА аб становішчы СМІ ў Беларусі, якую прынялі днём раней у Салоніках міністры замежных справаў краінаў, што ўваходзяць у Савет Эўропы. (вытрымкі з яе рэдакцыя ТМ друкуе ніжэй).

Менская канферэнцыя ў сваю чаргу прыняла АДКРЫТАЕ ПАСЛАННЕ аб падаўленні недзяржаўных СМІ ўладамі Беларусі, ХАДАЙНІЦТВА па справе "О прекращении деятельности газеты "Свабода", шэраг іншых заяваў і дакумэнтаў, якія будуць вынесеныя таксама на абмеркаванне Першага зьезду Беларускай асацыяцыі журналістаў, які мяркуецца склікаць у гэтую суботу.

Уласная інф.

Заявление

по поводу свободы выражения и средств массовой информации в Республике Беларусь

...Указывая на неоднократные сообщения о действиях белорусских властей, направленных на ограничение свободы информации, включая 1) прямое подчинение некоторых основных средств массовой информации Администрации Президента, 2) аресты журналистов, 3) закрытие средств массовой информации (таких, как газета "Свабода", телевизионная станция "8 канал" и радиостанция "Радио 101.2"), 4) преследование СМИ;

Отмечая также, что белорусское правительство предложило поправки к Закону о печати, которые запрещают "критику Президента и других должностных лиц", а также предсталяют администрации право приостанавливать деятельность газет и препятствовать ввозу информационных материалов, которые, по мнению властей, могут нанести ущерб политическим и экономическим интересам Республики,

а) Выражают серьезную озабоченность по поводу этих действий, несоответствующих нормам Европейской Конвенции о правах человека, и нарушающих свободу выражения и свободу средств массовой информации;

b) Выражают поддержку издателям и журналистам, работающим в печатных и электронных СМИ, которые в крайне сложных условиях стремятся укреплять ценности свободы слова, прессы и открытых общественных дебатов, поддерживают требования, звучащие как в Беларуси, так и за ее пределами, привести законодательство о СМИ в Беларуси в соответствие с демократическими стандартами;

c) Призывают белорусские власти незамедлительно принять соответствующие меры с целью создания политической, законодательной и административной основы, базирующейся на уважении свободы информации и независимости СМИ, как основополагающего условия демократического развития страны, и отмечают, что Беларусь уже взяла на себя соответствующие обязательства, подписав ряд международных соглашений;

d) Выражают надежду, что эти меры позволят Беларуси в итоге присоединиться к сообществу демократических государств.

P.S. *Российская Федерация не подписала данное заявление.*

Павал Шарамет: "Жду окончания кошмара..."

Магчыма, што калі выйдзе гэты нумар газэты, усе мы ўжо будзем ведаць судовы вынік "справы Шарамета". Слуханне прызначанае на 17 снежня, якраз на той дзень, калі рэдакцыя ТМ працуе ў друкарні. Вось і няма магчымасці ў нашым тыднёвіку падаваць інфармацыю, якая б пачыналася са слова: учора...

Тое, што "вырашыць" суд, так ці інакш стане вядома. Іншая справа —ягоныя дэталі, сам ход, стыль і змест судовага паседжання, — усё гэта ад грамадства будзе зачынена. Суд прызначаны ў Ашмянах, а гэты горад у пераліку тых, вольны прыезд куды забаронены. Напярэдадні суда на гэтай падставе грамадскім абаронцам і назіральнікам у справе Шарамета, а сярод іх бацька і жонка Паўла, былы старшыня Канстытуцыйнага суду Ціхіня, старшыня Беларускага Хельсінскага Камітэта Процька, адмоўлена ў прысутнасці на судзе. Рашэнне прынята на падставе, між іншым, пастановы Савета міністраў СССР ад 1990 г., у якім, аднак, спасылкі на маленькі беларускі горад Ашмяны якраз і няма.

Тымчасам за два дні да суда кароткае інтэр'вью ў П.Шарамета ўзяў наш карэспандэнт. Вось што палічыў неабходным сказаць Павал чытачам ТМ.

— Суда жду спокойно, без страха. Хорошо понимаю, что суд выполнит то поручение, которое ему дадут "сверху". Дело наше уголовное, но думаю, что срок по приговору, предназначенный нам, будет "условным". Хотя кто знает, что может у нас случиться в любую минуту, когда руководителям страны безразличны такие вещи как правда, совесть, общественное мнение, международная реакция. Жду окончания всего этого кошмара, потому что действительно соскучился по работе, а политика — дело не мое. Теперешняя моя активность в этой сфере объясняется как гражданским беспокойством, так и тем, что власть сама выталкивает меня из профессионального поля в политическое. Надеюсь все же, что скоро вернусь к письменному столу и микрофону.

СВУПЭЦКІЯ НАТАТКІ

Досьвед Вольнага Панства

**(Працяг.
Пачатак у 30-м нумары ТМ).**

ДРУКАРНЯ.

Прыватная друкарня "Лонія" знаходзіцца ў мястэчку Вржэзна. Яна працуе практычна цэлы дзень, бо мае шмат замоваў на буклеты, рэкламныя плакаты і да т.п. Акрамя свупэцкай тут друкуюцца таксама яшчэ два тыднёвіка — мясцовы і з гораду Гнёзна. Выходзяць штомесяц і "невялічкія" гмінныя газэткі (фірмат А4, 8 старонак).

Увесь змест газэты рэдактар прыводзіць з сабой — на дыскетцы. У кампутарным пакойчыку "Газэту Свупэцку" выпускае амаль за дзве гадзіны адзін работнік. Рэдактар малюе яму на звычайным аркушу паперы прыблізны план кожнай старонкі, а той мусіць усё размеркаваць, уціснуць і выдаць ужо гатовыя для друку газэтныя палосы. У адзіным пакоі крыху ніжэй за асноўны паверх друкарні месціцца цэх. Апаратура ў ім больш сучасная, чымсьці ў магілёўскай друкарні, але гэтая інфармацыя больш для спэцыялістаў..

РАДЫЁ.

Магу сказаць, што мне вельмі пашанцавала, што я трапіў на стаж менавіта ў Свупцу. Бо там працуе калектыў і знаходзіцца сядзіба "Вялікапольскага Радыё Варта", якое вяшчае кругласутачна і ахоплівае ўвесь вялікапольскі рэгіён — карацей кажучы, мае аўдыторыю ў некалькі мільёнаў чалавек. У 1989-м годзе заснаваў радыё і даў на яго грошы прыватны чалавек. Стала працуе на радыё гэтаксама як і ў газэце, 10 асобаў. Зараз "Радыё Варта" карыстаецца вялікай папулярнасцю. (Даведка: Warta — гэта трэцяя па велічыні рака ў Польшчы).

Я быў запрошаны на праграму "Гайд Парк" — амаль дзве гадзіны прамога эфіру. Вядома, падчас праграмы былі некалькі перапынкаў на рэкламу і аб'явы. Гутарку разам са мной і вядучым вялі рэдактар "Газэты Свупэцкай" сп. Яцэк Барткавяк і журналіст польскага тэлебачання, які спецыяльна прыйшоў на праграму, каб даведацца з першых вуснаў пра стан СМІ на Беларусі і, канешне, увогуле пра нашы праблемы ўнутры дзяржавы.

Падчас размовы ў некаторых выпадках вядучы мяне нават не перакладаў, настолькі ўсё было ім блізка і зразумела. Хоць Польшча ўжо прайшла цяжкі шлях усталявання дэмакратыі, аднак часы ваеннага стану так проста не забываюцца... Былі і тэлефанаванні на студыю з пытаннямі больш падрабязна расправесці пра наш усходні рэгіён, пра стаўленне людзей да сённяшняй улады, пра рэаліі працы ТМ. Думаю, што я выкарыстаў, наколькі было ў маіх сілах, магчымасць выступіць перад такой шырокай аўдыторыяй дзеля таго, каб палякі дакладна ведалі сапраўднае становішча ў Беларусі. Хачу падкрэсліць, што і ўдзельнікі размовы, і тыя слухачы, што тэлефанавалі на студыю, цалкам падтрымваюць пазыцыю ТМ. Ім вельмі прыкра і балюча ўсведамляць, што іх блізкія суседзі вымушаны трываць пад ціскам антынацыянальнага таталітарнага рэжыму. Маральную падтрымку і нават словы падзякі за тое, што мы жывём і працуем на карысць свабоды і вольнасці роднага краю, я шчыра пераадрасоўваю ўсім чытачам і прыхільнікам нашай газэты.

А самы кранальны момант адбыўся са мной праз тры дні пасля перадачы. Мы з новымі сябрамі якраз завіталі на радыё. Гучала віншавальная праграма, падчас якой кожны жыхар вялікапольскага рэгіёну можа пазваніць і замовіць любімую песню, нават праспяваць яе сам. І тут здарылася наступнае. Чарговы слухач, прарваўшыся ў эфір, сказаў: "Перадаю віншаванне Віктару з Беларусі. Жыве Беларусь!" Можаце ўявіць, якія пачуцці ахапілі мяне пры гэтых словах невядомага сябра...

Заканчваючы тэму радыё, скажу, што каб замовіць таксі ў Свупэцкім рэгіёне, трэба затэлефанаваць... правільна, на Радыё Варта.

КУЛЬТУРНАЯ ПРАГРАМА.

Перш за ўсё паведамлю чытачам, што маім гідам па Свупцы быў рэдактар (не галоўны, бо апроч галоўнага ёсць проста рэдактары: гэта усе журналісты, якія пішуць і макетуюць сваю ўласную старонку) газэты сп. Вальдэмар Мірнік. За свае 25 год ён працаваў ужо ў некалькіх выданнях, а ў "ГС" — ад самага пачатку. Адначасова ён робіць рэпартажы і для радыё.

Адзінае, што Вальдэк не здолеў мне паказаць, — штогадовы агульнапольскі фэстываль мастацкіх фільмаў на тэму правінцыяльнага жыцця, што праводзіцца якраз у Свупцы, у прыгожым невялікім кінатэатры якраз насупраць рэдакцыі. Аднак ягонай віны тут ніякай не было: фэст заўсёды адбываецца ў першай палове лютага.

СПОРТ.

Паколькі і я і пан Вальдэк — былыя актыўныя спартоўцы, мы вельмі зблізіліся на гэтай глебе. У горадзе існуюць шмат камандаў па амаль усіх гульнявых відах спорту. Я прысутнічаў на матчах па баскетболу (палякі маюць сваё слова-адпаведнік — кошыкоўка), валейболу (сяткувка) і футболу (пілка ножна). На футбольным матчы спынюся падрабязней. Гэта была гульня на кубак Польшчы, і гаспадарамі поля былі футбалісты з Коніна — цэнтра ваяводства. У гэтым 80-тысячным горадзе стадыён умяшчае 20 тысячаў. Трэба заўважыць, што як каманда гасцей, так і гаспадароў не належаць да эліты польскага футболу. Тым ня менш на матчы прысутнічалі каля 7-мі тысячаў чалавек, нягледзячы на тое, што пачаўся ён а другой гадзіне папалудні. Наогул, цікавае сведчанне: у Польшчы балельшчыкі паўсюдна падтрымваюць "сваіх" у залежнасці ад рэгіёну. Напрыклад, балеюць за мясцовую гмінную каманду, потым —



за каманду са Свупцы, затым — з Коніна, і ўжо далей ідзе Познань, хоць гэта ўжо і іншае ваяводства. Але ж рэгіён адзін —Вялікапольскі. Як патлумачылі мае новыя сябры, Wielkapolska — гэта ядро нацыі, мясцовасць, адкуль пайшлі палякі як народ.

Дык вось, пасля гульні, а перамаглі да радасці гледачоў гаспадары, адбылася прэс-канфэрэнцыя. У невялікім пакойчыку былі накрытыя сталы: піва, бутэрброды. Два трэнеры адказалі на пытанні журналістаў, якіх было каля дзесяці чалавек. Але галоўнае, на мой погляд, адбылося крыху пазней. На прыступках перад дзвярыма ўдзельнікаў матча чакалі малыя аматары футболу, усім гадоў па 7-10. Трэба было бачыць, як яны кідаліся да кожнага іграка абодвух клубаў, нават да запасных і масажыстаў, з ўжо падрыхтаванымі паперкамі, дзе стаялі імёны, каб атрымаць аўтографы! Падумалася: няўжо гэта "зоркі" такой уж велічыні?.. Аднак выглядала гэта вельмі прыгожа і натуральна, бо ўжо з маленства палякі засноўваюць рысы сапраўднага патрыятызму. Як натуральным было і тое, што ніводзін з прадстаўнікоў каманд не адмовіўся паставіць свой подпіс.

ВЫСТАВА.

Напярэдадні Дня Незалежнасці ў Свупцы адчынілася выстава, прысвечаная адметным падзеям у гісторыі горада. У мясцовым музэі, які пакуль яшчэ знаходзіцца ў стане перабудовы і аднаўлення, дзве залы на першым паверсе прынялі ў сябе экспанаты пэрыяду Сярэдневечча, адкапаныя на тэрыторыі былога замка, фрагмэнты вопраткі байцоў Арміі Краёвай, якая змагалася за польскую незалежнасць, старыя фотаздымкі пачатку стагоддзя — Пляц Волі, цэнтральны рынак, што існуюць да сёння. На адкрыццё выставы сабраўся ўвесь гарадскі бамонд: бурмістр, кіраўнік Рады, дэпутаты, навукоўцы, рэдактары газэты і радыё. А са мной абыходзіліся так, быццам самы галоўны госць — гэта журналіст з Беларусі...

ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ.

Галоўнае польскае свята — адпаведнік нашага Дня Волі. У той дзень, 11-га лістапада 1918-га году Польшча стала Вольным Панствам.

Сённяшнія ўгодкі ў Свупцы былі незвычайнымі па свайму зместу, бо ў гэты дзень на галоўнай плошчы горада ўрачыста адкрывалі Помнік палеглым за свабоду, як пазначана на самім памятным знаку — палякам, загінуўшым у пэрыяд з 1914-га па 1939-ы год.

Раней на гэтым месцы стаяў старажытны помнік, які ў пачатку Другой сусветнай вайны зруйнавалі спачатку немцы, паставіўшы свой знак, а потым тое самае зрабілі саветы. І вось, нарэшце, перамагла справядлівасць: **свой** Помнік заняў сваё пачэснае месца на Пляцу Волі.

Ад раніцы, пасля імшы, да плошчы пачалі сцягвацца людзі. Былі і спэцыяльна прыехаўшыя на ўрачыстасць, і не толькі з блізкіх ваколіцаў, а і здалёк. Святочнае шэсце пачалося ад касцёла. Пад гукі аркестра працэсія, у якой ішлі дзеці і дарослыя, святары і прадстаўнікі ўлады, харцэры і вайскоўцы, падыйшла да Помніка, дзе была выстаўлена ганаровая варта. Афіцыйная частка з прамовамі і ўзнагароджаннем адмысловымі мэдалямі за заслугі перад горадам пяці лаўрэатаў заняла прыкладна паўтары гадзіны. Пляц Волі ў аздабленні старых і сучасных сцягоў, якія жыхары навакольных дамоў вывесілі на тэрасах і ў вокнах, выглядаў і ўрачыста, і адначасова неяк па-хатняму, па-сяброўску. На заканчэнне, пасля хвіліны маўчання ў гонар загінуўшых некалькі разоў быў дан залп з аўтаматаў.

У другой палове Дня Незалежнасці ў Свупцы адбылася яшчэ адна неардынарная падзея — адкрыццё новага, самага вялікага спартыўнага зала ў ваяводстве, з усім належным найноўшым абсталяваннем. Пасля цырымоніі адкрыцця ў ім адбыўся валейбольны матч з удзелам польскай каманды ветэранаў, якая яшчэ ў 70-х гадах была чэмпіёнам краіны.

СУСТРЭЧА З МАРЫЮШАМ БЭККЭРАМ.

Рэдакцыя "Газэты Свупэцкай" спэцыяльна запрасіла на сустрэчу са мной сп. Марыюша Бэккэра, выкладчыка рэлігіі ў некалькіх польскіх унівэрсытэтах. Падчас ваеннага становішча ў Польшчы ён з групай сяброў нелегальна выдаваў газэту, на яго быў аб'яўлены вышук (карта гонча), урэшце ён быў схоплены і адбыў срок у турме.

Наша размова з прафэсарам Бэккэрам складалася з двух частак. Спачатку ён распавядаў пра сваю працу на карысць дэмакратыі ў 80-х, а я задаваў яму пытанні, потым — наадварот. Асабліва цікавіўся мой суразмоўца рэлігійнай сітуацыяй у Беларусі, бо ў часы панавання камунізму менавіта польскі касцёл быў асяродкам культуры і веры ў дэмакратычныя перамены. Менавіта Касцёл быў тым духоўным апірышчам польскай нацыі, без якога немагчыма было б пабудаваць тую краіну, якую я бачыў на ўласныя вочы.

У нас, на вялікі жаль, такой адзінай, **нацыянальнай Царквы** на тэрыторыі краіны няма. І мы пагадзіліся са сп. Бэккэрам у тым, што гэта ніяк не ўмацоўвае свядомых беларусаў у іхняй барацьбе за свае чалавечыя і дзяржаўныя інтарэсы.

Што тычыцца формаў і мэтадаў сённяшняй барацьбы з нашым дыктатарскім рэжымам, то магу зазначыць, што яны ў асноўным супадаюць з тымі, пра якія распавёў мне пан Марыюш, калі ўспамінаў пра часы ваеннага стану ў Польшчы. Галоўны накірунак такой барацьбы — гэта **негвалтоўны супраціў**. Акрамя вулічных маршаў і публічных пратэстаў вельмі важна, нават неабходна супрацьпаставіць агрэсыўным саўкам, штодзённа даводзіць да вялікага кола людзей нашу Культуру , шанаваць ды працягваць здабыткі сапраўднай Беларускай Спадчыны.

Дарэчы, калі я пацікавіўся ў прафэсара Бэккэра, якім чынам ён пляну выкарыстаць аўдыёзапіс майго маналогу, які ён зрабіў на працягу гутаркі, то быў вельмі здзіўлены ягоным адказам. Аказалася, што пасля расшыфроўкі тэксту ён увядзе мой расповяд у свой курс лекцый (!), каб паведаміць студэнтам пра некаторыя рэаліі сучаснага ўнутрыбеларускага жыцця...

P.S. На развітанне рэдакцыйны калектыў "ГС" падарыў мне цудоўную кнігу аб Польшчы, якая нядаўна была надрукавана на ўсіх асноўных мовах свету. А рэдактар, пан Яцэк Барткавяк, "ад імя ўсіх свупэцкіх журналістаў" пажадаў нам як мага хутчэй пабудаваць цывілізаванае грамадства, каб мы маглі праводзіць такія ж стажы для польскіх калегаў...

Віктар СУДНІК.



Ці пачуе Расея?

Сойм Беларускага Народнага Фронту, які засядаў у мінулую суботу, у ліку іншых дакумэнтаў прыняў адзін, на які немагчыма не звярнуць асобнай увагі. Гаворка ідзе аб Звароце Сойму БНФ да кіраўніцтва Расеі. Праз коску ў звароце пазначаны таксама "развітыя краіны свету і міжнародная супольнасць", аднак увесь пафас і змест дакумэнта скіраваны расейскім уладам. Упершыню за гады свайго існавання Фронт спакойна і нароўных ня толькі звяртаецца на маскоўскі адрас, але і патрабуе ад Крамля ўсталявання цывілізаваных узаемаадносінаў паміж краінамі згодна міжнародных нормаў.

У звароце на канкрэтных фактах аналізуецца небяспека для расейскай і міжнароднай дэмакратыі адкрытых і таемных кантактаў беларускага рэжыму і асабіста Лукашэнкі з самымі адыёзнымі фігурамі расейскай палітычнай вярхушкі, не прымаючых пераменаў апошніх гадоў. Іх стаўка на Лукашэнку, імкненне прывесці яго ў Крэмль і замацавацца там самім, можа пры ўмове рэалізацыі задумы даць жахлівыя наследкі для свету.

Напрыканцы Звароту ад прэзідэнта і ўрада Расейскай Федэрацыі патрабавана:

— спыніць эканамічную і палітычную падтрымку дыктатарскага рэжыму Лукашэнкі

— ліквідаваць усе незаконныя сувязі спэцслужбаў Расеі са спэцслужбамі і выканаўчымі структурамі Беларусі.

Уласн. інф.

Януш Радзівіл

(да 342-х угодкаў зь дня гібелі)

Прадузятасьць — небяспечная зьява. Асабліва калі яна праяўляецца ў гісторыкаў. Калі яны ўжо створаць будзь-які стэрэатып, то зьмяніць яго вельмі цяжка. Сярод ахвяраў такога стэрэатыпу — Януш Радзівіл. Калі прыгадваеш яго імя, амаль заўсёды чуеш: "А, Януш — здраднік". Яшчэ са школы і я дрэнна ставіўся да асобы Януша Радзівіла. Але пасьля апрацоўкі шэрагу крыніцаў, па заканчэньні працы над гэтым артыкулам, мой стэрэатып паступова расьпусьціўся...

__Сталеньне ды загартоўка__

Нарадзіўся Януш Радзівіл у 1612 годзе. Бацька яго, Крыштаф Радзівіл, займаў пасады віленскага ваяводы і гетмана Вялікага княства Літоўскага. У 1624 г. хлопца накіравалі ў Слуцкую гімназію. Праз тры гады Януш паехаў вучыцца за мяжу, у Нямеччыну і Галяндыю. Падарожнічаў па Бэльгіі, Англіі ды Францыі. У 1633 г. Януш прызначаны на пасаду падкаморніка ВКЛ. У гэтым жа годзе Радзівіл на чале невялікага збройнага атраду, разам з суайчыннікамі абараніў ад маскоўскай навалы Смаленск. Пасьля заканчэньня ваенных дзеяньняў Януш паехаў у Кракаў, тагачасную сталіцу Польшчы, дзе ўзяўся выконваць абавязкі падкаморнага пры двары караля. Ужо ў гэты час Януш вызначаўся палымянасьцю ды ўпартасьцю. У 1638 г. Януш Радзівіл ажаніўся. Яго жонка Катажына паходзіла з польскага магнацкага роду Патоцкіх. Праз нейкі час пасьля яе сьмерці ў 1642 г. Януш зноў жэніцца. На гэты раз на старэйшай дачке малдаўскага князя Базыля Лунула — Марыі.

__Трыюмф__

У 1646 г. Януш Радзівіл заключыў з трансільванскім князем Юрыям-І Ракочы дамоўленасьць аб сумесных дзеяньнях супраць Турцыі. Кароль польскі Уладзіслаў даў Янушу пасаду маршалка трыбунала літоўскага. У гэты час на Ўкраіне ўспыхнула паўстаньне на чале з Багданам Хмяльніцкім. 16 траўня 1648 г. пад Корсунем паўстанцы разьбілі войска Уладзіслава IV ды паланілі абодвух яго гетманаў. Кароль польскі раптоўна памёр. На сойме таго ж года Януш вылучыў сваю кандыдатуру на пасаду гетмана кароннага, але на гэты раз каралёўскай падтрымцы ён не меў. Тымчасам паўстаньне на Ўкраіне перарасло ў вайну. Шляхту ж Рэчы Паспалітай больш турбавалі выбары новага караля. Перамог брат нябожчыка — Ян Казімір.

Цяпер у Янушавай галаве сьпеў новы плян: аб'яднацца з Хмяльніцкім і сумесна разарваць іхнюю залежнасьць ад Польшчы. Але спачатку трэба было паказаць уласную моц. І Радзівіл са сваім войскам напачатку 1649 г. разьбівае паўстанцаў у Пінску, Мазыры, Бабруйску ды шэрагу іншых гарадоў. Увесь гэты час Януш пасылае ганцоў да Хмяльніцкага і да князя трансільванскага з прапановай аб'яднаньня, але іхняй згоды не атрымвае. Тады Радзівіл рушыць на Кіеў. У бітве, што адбылася 31 ліпеня 1649 г. пад Лоевам, ён разьбіў 30-тысячнае войска паплечніка Хмяльніцкага Міхаіла Крычэўскага.

16 сьнежня 1650 г. Януш зьявіўся на варшаўскі сойм. Ён склаў перад каралём казацкія сьцягі, захопленыя пад Лоевам. І хоць польскі ўрад заключыў перад гэтым перамір'е з паўстанцамі, сенат быў вымушаны ўзнагародзіць героя: ва ўласнасьць Радзівіла пераходзяць гарады Себеж і Невель, кароль дае Янушу пасаду старасты Барысава. Тымчасам войскі Хмяльніцкага нечакана напалі на Малдавію. Януш ізноў ідзе на Кіеў. Пасьля перамогі 16 ліпеня 1651 г. (ізноў) пад Лоевам, войска Радзівіла захапіла Чарнігаў, а потым і Кіеў. Плянавалася, што хутка будзе ўжо апошняя перамога над Хмяльніцкім, але 29 верасьня ў Белай Царкве польскі кароль зноў заключыў зь ім мір.

У 1653 г. на сойме ў Берасьці, у арэоле славы вялікага палкаводца, Януш Радзівіл патрабаваў ад Яна Казіміра, каб ён прызначыў яго віленскім ваяводай. Кароль вымушаны быў пагадзіцца.

ПАРАЖЭНЬНІ І СЬМЕРЦЬ

А ў гэты час Багдан Хмяльніцкі вёў перамовы з Масквою. 8 студзеня 1654 г. была падпісаная дамоўленасьць аб уз'яднаньні Украіны з Расеяй. Пасьля гэтага цар Аляксей Міхайлавіч афіцыйна абвесьціў вайну свайму заходняму суседу. Войскі ВКЛ цярпелі адну паразу за другой ад расейцаў і казакаў.

Януш Радзівіл прыкладаў велізарныя намаганьні, каб спыніць навалу з усходу. Але 12 жніўня 1654 г. пад Шкловам і праз некалькі дзён ля вёскі Шпялевічі Радзівілава войска было амаль ушчэнт разьбітае. Усё ж гетман не здаваўся і пайшоў на аблогу захопленага Магілёва. На жаль, пасьля няўдалага штурму горада, у траўні 1655 г. войска мусіла адступіць. Расейцы ж за гэты час акупавалі ледзь ня ўсю Беларусь, пала нат Вільня.

Тымчасам на Польшчу пасьпяхова напала Швэцыя. Януш вырашыў скарыстаць з гэтай акалічнасьці дзеля карысьці Вялікага княства. 18 жніўня 1655 г. ім была падпісана пагадненьне аб пераходзе ВКЛ да ўніі са Швэцыяй. Сярод яго пунтаў можна вылучыць свабоду голасу, верывызнаньняў. Узрадаваныя швэды абяцалі забясьпечыць саюзьнікаў порахам, зброяй ды грашыма... але слова сваё не стрымалі. Успыхнуў бунт. Януш застаўся без войска, акрамя адданай яму тысячы ваяроў. Ён вырашыў змагацца да канца, рыхтуючыся да абароны занятага ім тыкоцынскага замку.

...12 сьнежня 1655 г. Януш Радзівіл раптоўна памёр. Пасьля сьмерці на ягоным целе выступілі чорныя плямы. Гэта яскрава сьведчыла аб тым, што князь быў атручаны. Так скончылася жыцьцё славутага прадстаўніка магнацкага роду Радзівілаў.

Зараз для мяне Януш Радзівіл ёсьць першым нацыяналістам у гісторыі ВКЛ (чытай — Беларусі). Гэты чалавек на працягу ўсяго свайго кароткага жыцьця вёў барацьбу за свабоду і незалежнасьць сваёй Радзімы. Па вялікім рахунку, то была барацьба за нас з вамі, ягоных нашчадкаў. То памянём яго добрым словам.

Алесь ФАМІН.

Улюбленыя браты і сёстры



"Вось абвяшчаю вам вялікую радасьць. Дзіця нам нарадзілася! Эмануэль. Князь супакою".

Ён прынёс сьвету і кожнаму чалавеку супакой і радасьць, моц і збаўленьне. Ці прыняў я радасную навіну аб Божым Нараджэньні да свайго жыцьця? А можа я далёка ад Езуса, далёка ад Яго Евангельля? А гэта азначае, што далей блукаюся ў цемры, хоць на сьвет прыйшло Сапраўднае Сьвятло. Далей жыву без сэнсу. Сэнсам жа ёсьць толькі Езус Хрыстос. Адкрылі гэта сьвятыя. Увесь час нам гэта паказваюць. Яны не памыліліся. Прынялі Езуса, Яго моц.

Таму збліжаючыся ў гэтым годзе да Езусавых ясьляў, запросім Божае Дзіця да сябе. Напоўнім радасьцю нашыя сэрцы і разам з вілігійным аплаткам занясём яе людзям. Будзем жа Анёламі абвяшчаючымі вялікую радасьць людзям, што жывуць гнаныя штодзённасьцю, людзям спрагнёным надзеі, міласьці і супакою.

Улюблены Брат, улюбленая Сястра! Няхай мае пажаданьні абудзяць у Табе вялікую адказнасьць за другога чалавека. Езус Хрыстос запрашае Цябе да чыннага ўдзелу ў гэтым сьвятым заданьні.

Ахвяруй Богу дзеля гэтай справы сваю малітву, свае клопаты і працу, свой смутак, цярпеньне і сваё дабразычлівае сэрца.

Перажываем апошнія гады, што прыбліжаюць Юбілей Нараджэньня Госпаднягa. Няхай гэты час станецца вялікім паходам братоў і сясьцёр усяго сьвету на ўзор пастыраў, што бягуць за Анёлам да Езуса.

Езусе, народжаны ў бэтлеемскай стайні, дай нам веру, надзею і любоў. Забяры ад нас перажываньні, страх і боязь. Адары нас здароўем, а Тваё блаславенства няхай заўсёды будзе з намі.

З малітвай і ўшанаваньнем кс. Уладзіслаў Блін.

У НОЧ З 24 НА 25 СНЕЖНЯ КАТАЛІЦКІЯ ВЕРНІКІ АДЗНАЧАЮЦЬ ХРЫСТОВАЕ НАРАДЖЭННЕ.

ГАЗЕТА ТМ АД УСЯЕ ДУШЫ ВІНШУЕ ЎСІХ З НАДЫХОДЗЯЧЫМІ КАЛЯДАМІ І ЖАДАЕ РАДАСЦІ, ВОЛІ І ДАБРАБЫТУ.

Сьвяточны расклад

24 СЬНЕЖНЯ 1997 Г. НАРАДЖЭНЬНЕ ЕЗУСА ХРЫСТА

17.30 — Канцэрт. Сьпявае парафіяльны хор.

18.00 — Вілігійная Імша. Сьпявае парафіяльны хор.

19.00 — "Паранены пастыр". Данііл Онж. Спэктакаль у выкананьні парафіяльнае моладзі.

25 СЬНЕЖНЯ

9.00 — Сьвятая Імша.

10.30 — Сьпявае парафіяльны хор.

11.00 — Сьвятая Імша. Правіць Яго Эмінэнцыя Казімір кардынал Сьвёнтэк, Арцыбіскуп Менска-Магілёўскай архідыяцэзіі, Мітрапаліт Беларусі. Сьпявае парафіяльны хор.

12.30 — Сьвятая Імша для дзяцей. Сьпявае дзіцячы хор музычнай школы N 5. Мастацкі кіраўнік — Натальля Нырковa.

13.30 — Спэктакаль для дзяцей "Батлейка".

14.00 — "Калядкі". Праграма ў выкананьні "Дамовага касьцёлу".

16.00 — "Паранены пастыр". Спэктакаль у выкананьні парафіяльнае моладзі.

17.00 — Канцэрт. Сьпявае Магілёўскі гарадскі хор. Мастацкі кіраўнік — Жанна Елфімава.

18.00 — Сьвятая Імша. Сьпявае маладзёвы парафіяльны хор.

19.00 — Канцэрт. Выступаюць Магілёўскі гарадскі камэрны хор і аркестар. Мастацкі кіраўнік — Сяргей Лішчанка.

Хто мае жаданьне замовіць на Каляды калядоўшчыкаў, зьвяртайцеся да нас. Назабавім дарма.

Тэл. 25-57-85 (пасьля 18.00). Алесь.

Малады Беларус!

Адкрый для сябе Беларусь. Будзьма разам.

Тэл. 25-57-85 (пасьля 18.00). Алесь

ЛАРЫСА ГЕНІЮШ

Краіне

Ці за рокат гучных
громаў,
што начамі б'юць,
ці то за страху
з саломы
я цябе люблю?
Ці за сумную
мо' долю,
за дзяўчат красу,
ці за тыя ветры
ў полі,
бунтам што гудуць?
Мо' за тыя
навальніцы
ў буйную вясну,
за лязо мо'
бліскавіцаў,
што па хмарах тнуць?
Ці за сілу гэтых
бураў,
што страсаюць сон,
ці за ветру сьпеў
хаўтурны,
ці за братні стогн?
Ці за ўздым бунтарны
Нёмну
ў скутых берагох,
за пярэкліч ночку
цёмнай
па старых шляхох?
Ці за бор, як
расшуміцца,
гневам задрыжыць?
Ці за зоры-зараніцы,
што прыйдуць
сьвяціць?
Ці за сэрцы, што
аб грудзі
рытмам волі б'юць?
Ах, за што ж цябе,
мой цудзе,
як жыццё люблю?



СВАБОДА

Лагатып з выявай назвы газэты СВАБОДА, забароненай уладамі, стаў папулярнай рубрыкай у міжнароднай сетцы Internet і ўва многіх дэмакратычных выданнях Беларусі. Рэдакцыя ТМ далучаецца да тых, хто лічыць, што нават закрыццё газэты не азначае закрыцця журналісцкай творчасці. На гэтай старонцы сёння ў нас — матэрыялы супрацоўнікаў газэты "Свабода".

Алег Груздзіловіч

СВАБОДУ СВАБОДЗЕ!

Мітынг у падтрымку газэты СВАБОДА адбыўся ў нядзелю ў Менску.

На плошчы Якуба Коласа, дзе праводзілася акцыя, якую арганізавала Беларуская асацыяцыя журналістаў, сабралася больш за тысячу чытачоў газеты і яе прыхільнікаў. Перад імі выступілі журналісты СВАБОДЫ, чытачы газеты, а таксама вядомыя беларускія палітыкі.

Намеснік старшыні БНФ Юры Хадыка, у прыватнасці, выказаў салідарнасць з барацьбой журналістаў забароненай газеты і паведаміў аб рашэнні сойму БНФ, які адназначна заявіў, што Народны Фронт падтрымае намаганні калектыву СВАБОДЫ па адкрыцці новага выдання. Юры Хадыка вітаў той факт, што СВАБОДА захавала незалежнасць не толькі ад дзяржавы, але і ад палітычных партыяў. "Менавіта таму людзі і верылі СВАБОДЗЕ, што бачылі ў ёй крыніцу аб'ектыўнай інфармацыі", — адзначыў Хадыка.

У падтрымку газэты ад імя Аб'яднанай грамадзянскай партыі выступіў на мітынгу старшыня АГП Станіслаў Багданкевіч. Ён упэўнены, што закрыццё СВАБОДЫ — сплянаваная палітычная акцыя, накіраваная на замацаванне рэжыму, які трымаецца на ілжы, рэпрэсіях і эканамічных злачынствах. С. Багданкевіч заклікаў удзельнікаў мітынгу і ўсіх прыхільнікаў дэмакратыі павялічыць намаганні па абароне свабоды друку ў Беларусі. "Свабоду СВАБОДЗЕ!" — гэты воклiч неаднаразова гучаў на мітынгу ў Менску 14-га снежня.

Уладзімір Валеўскі

КАРУПЦЫІ БОЛЬШ НЕ БУДЗЕ

Чыноўнікі самых розных дзяржаўных структур павінны падпісаць вельмі арыгінальны дакумент —абавязацельства не займацца карупцыяй.

Спэцыяльныя бланкі з тэкстам гэтага абавязацельства разасланыя з Менску па ўсёй краіне. Патэнцыйным карупцыянерам трэба толькі ўпісаць сваё прозвішча, паставіць дату і подпіс.

Чыноўнікі-падпісанты абяцаюць, што болей не будуць выкарыстоўваць сваё службовае становішча пры вырашэнні пытанняў, якія закранаюць іх асабістыя інтарэсы або інтарэсы іх сем'яў. Акрамя таго, службовыя асобы бяруць на сябе вельмі цяжкі абавязак — "не ствараць перашкодаў фізічным і юрыдычным асобам у рэалізацыі іх правоў". Гэты пункт у афіцыйным дакуменце выглядае асабліва здзекліва: чыноўкі жывуць на грошы падаткаплацельшчыкаў і іх прамы абавязак — якраз забяспечваць выкананне правоў грамадзянаў.

Чыноўнікі таксама абавязваюцца "не атрымліваць падарункаў у сувязі з выкананнем службовых абавязкаў". А каб служба не здавалася надта ж горкай, дазваляецца браць "сімвалічныя знакі ўвагі і сімвалічныя сувеніры".

А тыя, хто не падпіша паперу, — будуць звольненыя з працы. У тэксце дакумента так і гаворыцца: "непадпісанне такіх абавязацельстваў служыць падставай для звальнення са службы". Так што карупцыянераў у дзяржаўных органах больш не будзе.

МАГІЛЁЎ: ДАЎНІНА І СУЧАСНАСЦЬ

Гістарычны агляд І.Марзалюка

На якіх старажытных малюнках адлюстраваныя выявы нашага горада?



Каштоўнымі крыніцамі па гісторыі Магілёва зьяўляюцца гравюры XVIII ст., знакамітая фрэска кармеліцкага касцёла Св.Станіслава з панарамай горада (створана каля 1765-1767 г.г.), малюнкі Н.Львова і І.Пешкі канца XVIII-XIX ст.ст.

Найбольш ранняя сярод іх — гравюра В.Вашчанкі з надпісам "Градъ Могилевъ" — надрукавана ў "Кнізе жыцій святых", якая была выдадзена 12 снежня 1702 г. ці ў 1703 г. У цэнтры гравюры змешчаны Багаяўленскі храм. З правага боку — чатырохярусная манастырская званіца, за ёй — дамкі жаночага Багаяўленскага манастыра. Злева —цёплая царква Іаана Багаслова і манастырскія карпусы, у якіх размяшчалася ў той час брацкая друкарня. На пярэднім пляне —умацаванні бастыённага тыпу і Каралеўская брама.

Такія чынам, на гравюры адлюстраваная частка панарамы Старога горада з боку Шклоўскага пасаду. Мяркуючы па перспэктыве, відавая кропка, з якой разгортваўся такі агляд, знаходзілася побач з месцам, дзе пазней пабудавалі мураваны карміліцкі касцёл Св.Станіслава, бліжэй да вуліцы Ветранай, адкуль "чыталіся" два бастыёны вала і размешчаная ў правым баку гравюры Каралеўская брама.

Вельмі цікавай крыніцай па планіроўцы Магілёва зьяўляецца нямецкая гравюра XVIII ст. Наконт яе існуюць супярэчлівыя меркаванні. Лічылася, што на ёй Гародня, а не Магілёў. Даволі пераканаўча гэты погляд аспрэчвае гарадзенскі даследчык А.Краўцэвіч. Гісторык архітэктуры І.Слюнькова таксама мяркуе, што на гравюры — выява Магілёва. Аднак аргумэнтавацьсвой пункт гледжання даследчыца не здолела, яе галоўнай памылкай зьяўляецца сцвярджэнне, што на гравюры адлюстравана планіроўка горада з боку Дняпра. У такім выпадку немагчыма "прывязаць" ніводнага помніка архітэктуры да рэальна існаваўшых на той час.

Зусім іншая справа, калі лічыць, што мы маем выгляд з боку Дубравенкі. Тады ў цэнтры гравюры — Дубравенская мураваная брама. За брамай, на ўзвышшы, паказаны будынак велічнага храма. У ім лёгка пазнаецца Багаяўленская царква, злева ад яе — добра знаёмая нам чатырохярусная званіца Багаяўленскага манастыра. З правага боку ад царквы, у накірунку да замка, бачым мураваную вежу —верагодна, гэта ратуша.

Больш за ўсё пытанняў выклікае выява абарончa-палацавага комплексу на замкавай гары, пісьмовыя крыніцы XVII-XVIII ст.ст. не згадваюць аб яго будаўніцтве. Напэўна гэта не маючая нічога агульнага з рэчаіснасцю стылізацыя. Тое ж самае тычыцца і абарончага валу. Сапраўды, частка сцяны ад Дубравенскай брамы была мураваная, мела амбразуры і злучалася з замкам, аднак на гравюры яна ідзе паралельна ўмацаванням апошняга і адразае замак ад Дубравенкі, што не адпавядае сапраўднасці.

Куды больш дакладнай зьяўляецца ацалелая фрэска 1765-1767 г.г. касцёла Св.Станіслава. Яна напісана з вялікім рэалізмам, паслядоўнае размяшчэнне помнікаў архітэктуры адпавядае сапраўднаму стану справаў. На фрэсцы паказана панарама горада з боку Задубравенскага пасаду. У верхнім левым куце выявы, на тэрыторыі Шклоўскага пасаду, мы бачым кармеліцкі касцёл Св.Станіслава,, абкружаны рэдкаю жылою забудовай. Унізе, на ўзвышшы, левы схіл якога мяжуе са спускам на вуліцу Віленскую, надзвычай дакладна адлюстраваны комплекс Бліжняй Васкрасенскай царквы — невялікі драўляны будынак храма, званіца, гаспадарчыя і жылыя пабудовы, абнесеныя плотам з брамай у бок ракі Дубравенкі. Малюнкі канца XVIII — пачатку XIX ст.ст. пацвярджаюць рэальнасць архітэктурных дэталяў і планіроўкі царквы.

Далей перад нашымі вачыма разгортваецца панарама Старога горада: Каралеўская брама, недалёка ад яе — трохнефавы двухвежавы езуіцкі касцёл Св.Ксаверыя, намаляваны з тыльнага боку. За ім у прасторы з правага боку ад капелюша маршалка і да бакавога фасаду Багаяўленскага храму змешчана выява будынка, якую І.Слюнькова атаясамляе з замкам. На самой справе перад намі галоўны фасад Багаяўленскай царквы, які пасля шматлікіх перабудоваў XVII-XVIII ст.ст. набыў такі выгляд і захоўваў яго нязменным да свайго зьнішчэння ў XX ст. Мастак імкнуўся адлюстраваць усё хараство храма, пайшоў на парушэнне перспэктывы і "разгарнуў" галоўны фасад, які не мог так выразна праглядацца з узятай ім відавай кропкі агляду горада. Ён (фасад) перакрывае мураваную Спаскую царкву. На фрэсцы бачны яе галоўны купал з вежачкамі па баках. Уся тэрыторыя Старога гораду паказана шчыльна забудаванай, размяшчэнне дамоў падпарадкаванае рэльефу мясцовасці.

МУЗЫЧНАЯ ГАСЦЁЎНЯ ТЫДНЁВІКА

На мілагучнай роднай мове

Карэспандэнт ТМ Дзяніс Новікаў прадстаўляе сваю гутарку з лідэрам магілёўскага гурта "Зьніч" Алесем Таболічам.



— Алесь, раскажы пра свой гурт і крыху пра сябе.

— Раней наш гурт меў назву "Жах". Гралі мы на той час панкрок. Але прайшоў час, змянілася ідэя, і зараз "Зьніч" выконвае музыку ў стылі цяжкага року. Што тычыцца назвы гурта, то Зьніч — гэта бог пахавальнага агню, шырэй —нязгасны агонь, які жыве вакол нас. Я быў заснавальнікам гурта, а мая непасрэдная функцыя — спеў. Калі я яшчэ вучыўся ў школе, я слухаў такія гурты, як "Уліс", "Мроя". Мне вельмі падабалася іх музыка. І я вырашыў, што трэба зрабіць нешта новае на нацыянальнай рок-сцэне. Зараз наша творчасць грунтуецца на традыцыях паганскай культуры, якая была вельмі развітая ў беларусаў. У свой час нашыя людзі пакланяліся паганскім багам, і рабілі гэты рытуал, карыстаючыся сваёй роднай, прыгожай і мілагучнай мовай.

— Прывядзі прыклад канкрэтнага паганскага матыву, які вы ўжо выкарыстоўвалі.

— Першы наш альбом "Язычнік Я" стварэўся на падмурку старажытнага падання пра племя, якое жыло пад Слонімам, і называлася неўры. Кожны год у адмысловы дзень яны пераўтвараліся ў ваўкалакаў.

— Ці стаяла перад вамі пытанне выбару мовы спеваў?

— Мы любім і шануем нашу родную мову. Мне самому непрыемна, калі беларускія гурты спяваюць па-расейску. У нас ёсць свая мова, свая культура і свая нацыя.

— Ці ўсе музыкі вашага гурта —паганцы? Можа, ёсць людзі іншых веравызнанняў?

— Так, ёсць і іншыя. Мы не ставім перад сабой мэту зрабіць усіх паганцамі. Мы сабраліся, каб граць сваю музыку ды нагадаць усім, хто забыўся, што ў нас былі і ёсць свае звычаі і свая спадчына.

— Ці прымалі вы ўжо ўдзел у фэстах і канцэртах?

— Большасць канцэртаў у нас адбылася ў Менску. Мы бралі ўдзел у "Рок на Купалле", на фэсце з нагоды 930-годдзя Менску. Выступалі ў Лідзе. Але галоўнай падзеяй для нас была паездка на славуты фэстываль "Басовішча" у Беласток. Там людзі вельмі добра ставяцца да ўсяго беларускага, і там вельмі ўважлівая публіка.

— Ці можна вас лічыць палітычным гуртом?

— У нас не палітычны гурт. Кожны з нас мае свае меркаванні ў рэчышчы палітыкі. Але ў тэкстах і музыцы яна ў нас не прысутнічае. Галоўнае для нас — адрадзіць тую старажытную культуру, якую мы згубілі... У Беларусі зараз шмат гуртоў, якія спяваюць менавіта пра палітыку.

— Якія вашы наступныя пляны?

— Рыхтуемся да выпуску альбома. Хутка мы зробім у Менску яго прэзэнтацыю. Ну і, канешне, паспрабуем паездзіць па гарадах з канцэртамі.

— Мне вядома, што ты вучышся на мастака. Што ты думаеш рабіць пасля заканчэння вучобы?

— Я буду вучыцца далей, каб здзейсніць мару сваю і маіх бацькоў. Мае вочы — гэта мастацтва, а вушы — музыка. Калі іх раз'яднаць, нічога карыснага не атрымаецца. Па-мойму, толькі ў такім спалучэнні можа існаваць творчы чалавек.

— Напрыканцы што б ты хацеў яшчэ сказаць?

— Я хачу, каб маладыя не сумавалі, а рабілі самі што-небудзь цікавае. Каб наш горад не спаў, а жыў у поўным сэнсе гэтага слова. Каб стваралася больш гуртоў, рабілася больш канцэртаў. Каб усе слухалі добрую музыку, і асабліва — нашу.

Шаноўныя чытачы! Па ўсяму, гэта апошні нумар Тыднёвіка ў бягучым годзе. Жадаем усім нам лепшай долі ў годзе новым і спадзяемся на хуткае спатканне.

Заснавальнік і рэдакцыя ТМ.



Дарагія дзеці і дарослыя!

Магілёўскі абласны тэатар лялек віншуе ўсіх с надыходзячым Новым годам!

Дзед Мароз і Снягурачка ўстрайваюць традыцыйныя Навагодняя ранішнікі і прымаюць заказы ад прыватных асобаў і арганізацыяў за наяўны і безнаяўны разлік.

Елка ў тэатры лялек — найлепшая ў горадзе!


Вас чакаюць захапляючыя казачныя прыгоды і падарункі!

Тэлефон для даведак : 25-84-89; 22-86-83.

Перакладзіце на беларускую мову

Па гарызанталі: 7. Сумерки. 8. Снаряжение. 11. Жара. 12. Икона. 13. Резонность. 16. Подсчет. 17. Падеж. 18. Дань. 21. Подосиновик. 22. Занос. 23. Болтун. 24. Верующий. 29. Колесико. 30. Пробка. 31. Ребрышко. 35. Зачинщик. 37. Приятель. 38. Колодка (сапож.). 39. Ранняя заря. 40. Сердечко.

Па вертыкалі: 1. Остановка. 2. Бегство. 3. Матушка, мама. 4. Костыль. 5. Грусть. 6. Годовщина. 9. Остатки. 10. Ноготки (бот.). 14. Интерес. 15. Устье (у печи). 19. Мак-самосейка. 20. Размер. 25. Гладь. 26. Калужница. 27. Почет. 28. Корка. 32. Ласка (зоол.). 33. Корсет. 34. Топь. 36. Гамаша.



Рэдактар Генадзь СУДНІК





Інфармацыйна-аналітычная газета, заснаваная Магілёўскай гарадской асацыяцыяй "КОЛА СЯБРОЎ".

Зарэгістравана ў Дзяржкамітэце Рэспублікі Беларусь па друку за № 831.

Газета выходзіць па пятніцах, пераважна на беларускай мове..



Кошт аднаго асобніка газэты ў гандлі праз сістэму Саюздруку — 2.000 рублёў. У свабодным продажы і ў грамадскіх распаўсюджвальнікаў — па дамоўленасці.



АДРАС РЭДАКЦЫІ:
212030 г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.



ТЭЛЕФОНЫ:
31-04-15, 22-97-82

Газета набрана і надрукавана афсетным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.М.Свярдлова. Зак. 31. Тыраж 2100 асобнікаў.